## ЛІТАРАТУРА:

1. Косаў С. // Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыкл. даведнік. – Мн., 1995. – С. 240–241.
2. Макарий. История русской церкви. Кн. 6. – М., 1996.
3. Падокшын С.А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура. – Мн., 1998.
4. Саверчанка І. Сільвестр Косаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 1995. – № 3. – С. 178–185.
5. Сильвестръ (Коссовъ) // Русский биографический словарь. – СПб., 1904. – С.433–437.


*Колабава І.Н. (Мінск, Беларусь)*

# ФОНД ГРАШОВАГА АБАРАЧЭННЯ НА ТЭРЫТОРЫІ МАГІЛЁЎШЧЫНЫ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVII ст.

Асаблівасці складу манетнага фонду Магілёўшчыны другой паловы XVII ст. фармаваліся пад уплывам узаемадзеяння паміж грашовымі гаспадаркамі Рэчы Паспалітай і Расіі.

Грашовыя дэпазіты гэтага перыяду, адкрытыя на землях усходняй Беларусі, прадстаўлены эмісіямі манетных двароў Рэчы Паспалітай, Шведскай Прыбалтыкі, дзяржаў Заходняй Еўропы і Расіі.

Другая палова XVII ст. характарызуецца незваротнымі працэсамі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага аслаблення дзяржаўнага арганізма Рэчы Паспалітай, што, вядома, адбілася і на стане яе дзяржаўных фінансаў. Яшчэ ў 1649 г. Варшаўскі сейм канстатаваў заняпад манетнай справы ў краіне, у выніку чаго " розныя іншаземныя фальшывыя (нізкапробныя – І.К.) манеты да Кароны і Вялікага княства Літоўскага ўвозяцца" [11, 131].

Яскравым праяўленнем гэтага крызісу з'явілася рэформа Яна Казіміра II Вазы (1659–1666), якая ўвяла ў абарачэнне велізарную масу крэдытных медных солідаў і білонных трыдцаціграшовікаў [12, 279]. У 1656 г. рэзка зніжаецца проба шасціграшовікаў і ортаў, практычна спыняюцца эмісіі білонай (у першую чаргу – шэлегаў) манеты.

Пры вывучэнні праблем, характарызуючых канкрэтны склад сродкаў абарачэння, плацяжу і назапашвання ўсходнебеларускага грашовага рынку разглядаемага пярыяду, неабходна ўлічваць шэраг яго спецыфічных асаблівасцяў.

З другой паловы XVII ст. грашовая гаспадарка, якая базіравалася на значнай масе нізкапробнай манеты і параўнальна невялікай колькасці срэбраных і залатых манет, усе часцей адыходзіць ад традыцыйных нормаў рыначнага абарачэння і ліку. Назіраюцца рэзкія ваганні курсаў асноўных наміналаў і вартасных суадносін паміж імі. Манеты заходнееўрапейскіх краін часцей за ўсё абарачаліся на рынках Беларусі пад тымі жа назвамі, што і іх польска-літоўскія цёзкі, гэта значна



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абцяжарвае ідэнтыфікацыю іншаземнай чэканкі сярод узгадваемых пісьмовымі крыніцамі грашовых сум.

Інтэнсіўныя эмісіі непаўнавартаснай манеты пры сінхроным скарачэнні выпуску паўнавартасных наміналаў выклікалі інфляцыйныя працэсы, што прывяло да далейшага пашырэння маштабаў імпарту нізкапробнай іншаземнай манеты. У выніку пры аднолькавай афіцыйнай вартасці, але пры рознай якасці, з абарачэння знікалі (тэзаўрыраваліся, вывозіліся за мяжу) тыя з аднаіменных манет, якія ўтрымлівалі больш высакароднага металу.

Можна назваць толькі два наміналы, курс абарачэння якіх працягваў заставацца адносна стабільным – гэта таляр і дукат.

У разглядаемым пярыядзе ў грашовай гаспадарцы Рэчы Паспалітай выкарыстоўваюцца такія лічбавыя паняцці, як "грош" і "злоты".

Характэрнай асаблівасцю манетнага фонду ўсходняй Беларусі была надзвычайная стракатасць рынычных сродкаў плацяжу. Манетная сістэма аперавала практычна тым жа (ад соліда да дуката), што і ў дзяржавах Заходняй Еўропы, наборам наміналаў.

На тэрыторыі Магілёўскай вобласці зарэгістраваны 62 манетныя скарбы другой паловы XVII ст. На жаль, не ўсе дэпазіты маюць поўнае вызначэнне. Тым не менш, на падставе сабраных матэрыялаў можна зрабіць высновы аб колькасным і якасным складзе скарбаў, вызначыць суадносіны паміж абарачаючыміся на тэрыторыі Магілёўшчыны манетнымі эмісіямі і, такім чынам, скласці агульную карціну стану манетнага фонду рэгіёна.

У выніку сістэматызацыі і аналізу сабранага матэрыялу атрыманы наступныя вынікі: вызначаныя скарбы ўтрымліваюць 17 667 экз., з іх атрыбуціраваны 9422 экз. (53,3 %).

Па дзяржаўнай прыналежнасці яны размяркоўваюцца наступным чынам: Вялікае княства Літоўскае – 0,2%, Польшча – 0,1%, Рэч Паспалітая – 27,4%, Паўночныя Нідзерланды (Рэспубліка Злучоных Правінцый) – 4,2%, Паўднёвыя (Гішпанскія) Нідзерланды – 3,7%, Прусія – 1,7%, Расія – 40,3%, Шведская Прыбалтыка – 19,9%, іншыя – 2,5%.

Аб'ём публікацыі не дазваляе даць дэтальную характарыстыку скарбаў, што прыводзяцца ў гэтым сістэматызаваным зводзе. Таму звесткі аб дэпазітах абмяжоўваюцца толькі дадзенымі аб месцы і часе знаходкі, колькасці ўтрымліваемых манет, дзяржавах-эмітэнтах і часе захавання (па датах малодшых манет).

***Бабруйскі р-н.*** **1.Бабруйск.** 1854. 3 экз. (срэбра) – Паўднёвыя Нідзерланды, Паўночныя Нідзерланды. Малодшая манета (далей – М.м.) – 1696. **2.Бабруйск**, да 1917. 3805 экз. (срэбра, білон, медзь) – Вял. кн. Літоўскае, Рэч Паспалітая, Германія, Прусія, Францыя, Шатландыя, Шведская Прыбалтыка. М.м. – 1666. **3.Бабруйск.** 1922. 3 экз. (золата, срэбра) – Паўднёвыя Нідзерланды, Паўночныя Нідзерланды, "Цэзарства". М.м. – 1660. **4.Ваўлічы**, урочышча. 1924. 60 экз.

(срэбра) – Паўднёвыя Нідзерланды. М.м. – пасля 1660. **5.Маль'ева**. 1951. 96 экз. (срэбра, білон, медзь) – Вял. кн. Літоўскае, Рэч Паспалітая, Прусія, Шведская Прыбалтыка. М.м. – 1666. **6.Ступені**. 1962. (срэбра) – Паўднёвыя Нідзерланды, Паўночныя Нідзерланды, Манака. М.м. – 4-я чвэрць XVII ст. **7.Сцяпанаўская вол**. 1924. 60 экз. (срэбра) – Паўдневыя Нідзерланды. М.м. – 1680. **8.Канкрэтнае месца знаходкі не ўстаноўлена**. 1922. 3 экз. (срэбра) – Германія, Паўднёвыя Нідзерланды, Паўночныя Нідзерланды. М.м. – 1660.

***Быхаўскі р-н.*** **9.Быхаў.** 1885. 147 экз. (срэбра, білон) – Рэч Паспалітая, Расія, Шведская Прыбалтыка. М.м. – 1653. **10.Быхаў**. пач. 1830-х гг. 100 экз. (срэбра, білон, медзь) – Рэч Паспалітая, Шведская Прыбалтыка. М.м. – 1666. **11.Дабужа**. 1892. 52 экз. (срэбра) – Рэч Паспалітая. М.м. – 3-я чвэрць XVII ст. **12.Красніца**. 1904. 45 экз. (срэбра) – Рэч Паспалітая, Паўднёвыя Нідзерланды, Прусія. М. м. – 1699. **13.Ліпаўка**. ?, 9 экз. 1696. (срэбра) – Паўднёвыя Нідзерланды, Паўночныя Нідзерланды. М.м. – 1699. **14.Быхаў**. 1905. 2 экз. (срэбра) – Паўночныя Нідзерланды. М.м. – 1652. **15.Нераж.** 1925. 20 экз. (срэбра) – Рэч Паспалітая, Паўднёвыя Нідзерланды, Паўночныя Нідзерланды. М.м. – 1694. **16.Новы Быхаў.** 1958. 218 экз. Вял. кн. Літоўскае, Рэч Паспалітая, Нідзерланды, Шатландыя. М.м. – 1650. **17.Новы Быхаў**. 1958. 212 экз. (срэбра, білон, медзь) – Рэч Паспалітая, Брандэнбург, Паўночныя Нідзерланды, Прусія, Шатландыя, Шведская Прыбалтыка. М.м. – 1650. **18.Смоліца**. 1956. 2 экз. (срэбра) – Паўночныя Нідзерланды. М.м. – 1650. **19.Чачэвічы**. 1957. 89 экз. (срэбра) – Рэч Паспалітая, Паўднёвыя Нідзерланды, Паўночныя Нідзерланды. М.м. – 1698.

***Бялыніцкі р-н.*** **20.Бялынічы**. 1860. 3700 экз. (білон) – Рэч Паспалітая. М.м. – 3-я чвэрць XVII ст. **21.Грыва**, урочышча каля в. Вугольшчына. 1924. 50 экз. (срэбра) – Рэч Паспалітая, Венгрыя, Паўднёвыя Нідзерланды, Паўночныя Нідзерланды, Росток, Рэгенсбург, Саксонія, Ульм, Цiроль, Чэхія, Швейцарыя, Штральзунд. М.м. – 1654. **22.Клеўка**. 1913. 677 экз. (срэбра, білон) – Вял. кн. Літоўскае, Рэч Паспалітая, Германія, Паўднёвыя Нідзерланды, Паўночныя Нідзерланды, Прусія, Шведская Правінцыя. М.м. – 1663. **23.Кудзін**. 1896. (срэбра, білон) – Рэч Паспалітая, Паўднёвыя Нідзерланды, Паўночныя Нідзерланды, Прусія, Расія, Шведская Прыбалтыка. М.м. – 3-я чвэрць XVII ст. **24.Сныткі**. 1958. 3 экз. (срэбра, білон) – Рэч Паспалітая, Прусія. М. м. – 1679.

***Глускі р-н.*** **25.Бярозаўка**. 1924. 4 экз. (срэбра, медзь) – Рэч Паспалітая. М.м. – 1666. **26.Глуск**. 1925. 63 экз.(срэбра) – Рэч Паспалітая, Брандэнбург. М.м. – 1664. **27.Поблін**. 1917–1918. 2 экз.(білон) – Шведская Прыбалтыка. М.м. – 1664. **28.Канкрэтнае месца знаходкі не ўстаноўлена**. 1961. 36 экз. (срэбра, білон) – Рэч Паспалітая, Прусія. М.м. – 1699.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Горацкі р-н.*** **29.Андрухі**. 1909. 30 экз. (срэбра) – Паўднёвыя Нідзерланды. М.м. – 1685. **30.Буракі**. 1895. 20 экз.(срэбра, білон, медзь) – Рэч Паспалітая, Лівонія, Паўднёвыя Нідзерланды, Паўночныя Нідзерланды, Расія. М.м. – др. пал. XVII ст. **31.Верба**. пач.1920-х гг. 3 экз. (срэбра, білон) – Рэч Паспалітая. М.м. – 1666. **32.Вуглы** (маёнтак). 1889. 349 экз. (срэбра) – Расія. М.м. – Аляксея Міхайлавіча (1645–1676). **33.Галавічы**. 1926. 184 экз. (медзь) – Рэч Паспалітая. М.м. – 3-я чвэрць XVII ст. **34.Горкі**. 1858. 555 экз. (срэбра, білон) – Рэч Паспалітая. М.м. – 1685. **35.Горкі**. 1890. 30 экз. (срэбра) – Паўднёвыя Нідзерланды, Паўночныя Нідзерланды. М.м. – 1652. **36.Дрыбін**. 1957. 49 экз. (срэбра) – Германія, Кельн, Паўднёвыя Нідзерланды, Паўночныя Нідзерланды. М.м. – 1699. **37.Зубры**. 1895. 193 экз. (срэбра, білон) – Рэч Паспалітая, Прусія, Штэйермарк. М.м. – 1691. **38.Красуліна**. 1901. 12 экз. (срэбра) – Паўднёвыя Нідзерланды. М.м. – 1682. **39.Расна**. 1910. – 671экз. (золата, срэбра, білон) – Рэч Паспалітая, Брандэнбург, Венецыя, Гамбург, Любэк, Майнц, Ольдэнбург, Памеранія, Паўднёвыя Нідзерланды, Паўночныя Нідзерланды, Прусія, Расія, Трансільванія, Турцыя, Шведская Прыбалтыка. М.м. – 1653. **40.Сава**. 1888. 389 экз. (срэбра, білон) – Рэч Паспалітая, Паўночныя Нідзерланды, Прусія, Шатландыя, Шведская Прыбалтыка. М.м. – 1652. **41.Хамінічы**. 1895. 251 экз. (білон) – Рэч Паспалітая, Шведская Прыбалтыка. М.м. – 1653. **42.Цяплухі**. 1895. 10 экз. (срэбра) – Паўднёвыя Нідзерланды, Паўночныя Нідзерланды. М.м. – 1698. **43.Канкрэтнае месца знаходкі не ўстаноўлена**. Пасля 1945. 175 экз. (срэбра) – Паўднёвыя Нідзерланды, Паўночныя Нідзерланды. М.м. – др. пал. XVII ст.

***Кіраўскі р-н.*** **44.Любонічы**. 1962. 195 экз. (білон, медзь) – Рэч Паспалітая, Брандэнбург, Прусія. М.м. – 1654. **45.Любонічы**. 1964. 231экз. (срэбра, білон) – Вял. кн. Літоўскае, Польшча, Рэч Паспалітая, Брандэнбург, Зальцбург, Прусія, Сілезія, Шведская Прыбалтыка. М.м. – пасля 1666.

***Клімавіцкі р-н.*** **46.Судзілы**. 1900. 16 экз. (срэбра) – Рэч Паспалітая, Прусія. М.м. – 4-я чвэрць XVII ст.

***Крычаўскі р-н.*** **47.Крычаў**. 1888. 7 экз. (срэбра, білон) – Вял. кн. Літоўскае, Рэч Паспалітая, Прусія. М.м. – 3-я чвэрць XVII ст.

***Магілёўскі р-н.*** **48.Магілеў**. 1955. 562 экз. (срэбра, білон) –Польшча, Рэч Паспалітая, Брандэнбург, Прусія, Расія, Сілезія, Шведская Прыбалтыка. М.м. – 1652. **49.Магілёў**. 1956. 3350 экз. (срэбра) – Расія. М.м. – Аляксея Міхайлавіча (1645–1676). **50.Магілёў**. 1959. 19 (срэбра, білон) – Рэч Паспалітая, Прусія. М.м. – 1699. **51.Магілёў**. 1965. 1экз. (медзь) – Расія. М.м. – Аляксея Міхайлавіча (1645–1676).

***Мсціслаўскі р-н.*** **52.Юшкавічы**. 1918. 496 экз. (срэбра, білон) – Рэч Паспалітая, Расія, Курляндыя, Трансільванія. М.м. – 1663.

***Слаўгародскі р-н.*** **53.Слаўгарад**. 1928. 2 экз. (срэбра) – Рэч Паспалітая. М.м. – пасля 1676.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Чэрыкаўскі р-н.*** **54.Лобча.** 1902. 155 экз. (срэбра) – Паўднёвыя Нідзерланды, Паўночныя Нідзерланды. М.м. – 1672. **55.Малае Бушкава.** 1905. 4 экз. (срэбра) – Паўднёвыя Нідзерланды. М.м. – 1655.

***Шклоўскі р-н.*** **56.Даманы.** кан. 1950-х гг. 15 экз. (срэбра, білон) – Рэч Паспалітая, Прусія. М.м. – 1683. **57.Даманы.** 1961. 23 экз. (білон) – Шведская Прыбалтыка. М.м. – 1652. **58.Елькаўшчына.** 1910. 24 экз. (срэбра, білон) – Рэч Паспалітая, Паўночныя Нідзерланды. М.м. – 1652. **59.Лакуці.** 1893. 12 экз.(срэбра) – Паўночныя Нідзерланды. М.м. – 1657. **60.Ордаць.** 1890. 20 экз. (срэбра) – Паўднёвыя Нідзерланды, Паўночныя Нідзерланды. М.м. – 1699. **61.Ордаць.** 1897. 33 экз. (срэбра, білон) – Рэч Паспалітая, Прусія. М.м. – 1683. **62.Чорнае.** 1897. 120 экз. (золата, срэбра, білон) – Рэч Паспалітая, Браўншвейг, Венгрыя, Данія, Магдэбург, Нюрнберг, Ольдэнбург, Паўднёвыя Нідзерланды, Паўночныя Нідзерланды, Прусія, Росток, Саксонія, Страсбург, Франкфурт, Чэхія, Швейцарыя, Штейермарк, Штральзунд, Эрфурт. М.м. – пасля 1650.

## ЛІТАРАТУРА:


1. Архіў Інстытута гісторыі матэрыяльнай культуры Расійскай Акадэміі навук (С.-Пецярбург). Ф. 1, спр. 15, 25, 30, 51, 90, 133, 197, 215, 276, 285, 293. Ф. 2, спр. 27, 29.
2. Архіў Дзяржаўнага Эрмітажа (С.-Пецярбург). Ф. 1, спр. 15, 16, 19, 20, 30, 32.
3. Колобова И.Н. Монетныя клады. // Могилев: Энциклопедический словарь. – Мн.: БелСЭ, 1980.
4. Могилевские губернские ведомости. – 1889. – № 82.
5. Рябцевич В.Н. Монетныя клады XVII и первой четверти XVIII в. на территории Чернигово-Северской земли и восточной Белоруссии. Нумизматика и сфрагистика. – Киев: Изд-во АН УССР, 1963. Т. 1.
6. Рябцевич В.Н. Шотландские монеты первой половины XVII в. в кладах Белоруссии и соседних районов. // Нумизматика и эпиграфика. М., 1963. Т. IV.
7. Сотникова М. П. Материалы к топографии находок русских монет XIV-XX вв., зарегистрированных в Эрмитаже в 1948 – 1974 годах // Русская нумизматика XI – XX вв. – Л., 1979.
8. Gumowski M. Podręcznik numizmatyki Polskiej. – Krakowie, 1914.
9. Kopicki E. Katalog podstawowych typów monet i banknotów Polski oraz ziem historycznie z Polska związanych 1632–1795. – Warszawa, 1977. T.III.
10. Mikołajczyk A. Skarby monet z XVI, XVII, XVIII wieku zanotowane na byłym obszarze Wielkiego księstwa Litewskiego. Materiały do inwentaryzacji /Prace i materiały Muzeum Archeologicznego i etnograficznego w Łodzi. Seria numizmatyczna i konserwatorska. NR 5. 1985. – Łodz, 1987.
11. Volumina Legum. Przedruk zbioru praw, staraniem XX Pijrów w Warszawe, od roku 1732 do roku 1782 wydanego. – Peterburg, 1859. – T. II.
12. Volumina Legum. Przedruk zbioru praw, staraniem XX Pijrów w Warszawe, od roku 1732 do roku 1782 wydanego. – Peterburg, 1859. – T. IV.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛИТЕРАТУРА:


1. Дембовецкий А.С. Опыт описания Могилевской губернии. – Могилев-на-Днепре, 1882. Кн.1.
2. Национальный исторический архив Беларуси, ф. 2322, оп. 1, ед. хр. 78. 1855 г.
3. Музей старажытнабеларускай культуры Каталог экспазіцыі. – Мн., 1983.
4. Русские житийные иконы XVI–начала XX века. Каталог выставки Государственного Эрмитажа Санкт-Петербург 29 июня–3 октября 1999. – СПб., 1999.


*Грыцкевіч А.П.(Мінск, Беларусь)*

# АТЛАС МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ 1777 г. ЯК ГІСТАРЫЧНАЯ КРЫНІЦА

Адным з відаў гістарычных крыніц з'яўляюцца карты мясцовасцяў і планы гарадоў, якія складаліся ў XVIII-XIX стагоддзях у Расійскай імперыі. Гэтыя крыніцы маюць значэнне для вывучэння гаспадаркі таго часу, звестак пра населеныя пункты (галоўным чынам гарады), характарыстыку заняткаў жыхароў, іх нацыянальнага і рэлігійнага складу і інш. У фондах архіваў і Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбурзе захаваліся рукапісныя атласы губерняў Беларусі.

Такога роду гістарычнай крыніцай з'яўляецца рукапісны Атлас Магілёўскай губерні, складзены ў 1777 г., які знаходзіцца ў аддзеле рукапісаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбурзе пад шыфрам F-IY-768 [1, 1–13], як адзначаецца ў загалоўку, ён "створаны ў Магілёве". Складзены ён быў пасля далучэння ўсходняй часткі Беларусі да Расіі ў сувязі з увядзеннем новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу далучанай тэрыторыі. Мэта яго складання – гэта аблягчэнне губернскім і павятовым чыноўнікам кіраваць губерняй, звяртаючыся да Атласу як да даведніка пры вырашэні розных пытанняў адміністрацыйнага характару.

Усходняя Беларусь была далучана да Расіі ў выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай паводле Пецярбургскай канвенцыі паміж прадстаўнікамі ўрадаў Расіі, Прусіі і Аўстрыі пад асабістым наглядам Кацярыны II 25 ліпеня (5 жніўня) 1772 г. Аднак яшчэ раней, да афіцыйнага акта далучэння, 28 мая 1772 г. у сваім наказе загадзя навапрызначанаму магілёўскаму губернатару генерал-маёру В. Кахоўскаму расійская імператрыца абвясціла аб утварэнні Магілёўскай губерніі "з 4-х правінцый: Магілёўскай, Аршанскай, Рагачоўскай і Віцебскай, паміж Дзвіною і Дняпром". У снежні 1772 г. у складзе Магілёўскай губерні згадваюцца Магілёўская, Рагачоўская і Аршанская правінцыі і 12 паветаў, што ўваходзілі ў іх склад. 22 ліпеня 1773 г. Кацярынай II быў зацверджаны даклад сената "аб падзеле Беларускіх губерняў на